# З РОДНЫМ СЛОВАМ НА СВЯТА Ў МУЗЕЙ

18 мая, у Міжнародны дзень музеяў творцы з Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Шаўчэнка, паэтэса і літаратурны крытык Святлана  Тарасава, паэты Віктар Курловіч, Рыгор Гармаш і паэт-аматар Мікалай Іваноўскі разам са мной наведалі Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, які стварыў вядомы на ўсю краіну краязнаўца і настаўнік Алесь Мікалаевіч Белакоз.

Адбылася цікавая сустрэча з чытачамі і аматарамі паэзіі, падчас якой паэты прачыталі свае вершы і новыя прысвячэнні гэтаму ўнікальнаму беларускаму краю. Дарэчы, Гудзевіцкаму музею нядаўна споўнілася 50 гадоў, і Міністэрства культуры ўзнагародзіла калектыў супрацоўнікаў, які шмат гадоў плённа шчыруе на ніве культуры і музейнай справы, Ганаровым Дыпломам. Шчыра віншуем, дарагія сябры! Здароўя вам і творчага натхнення!

Людміла КЕБІЧ

одноклассники

На фота: першы рад, злева направа: Мікалай Іваноўскі, Людміла Кебіч, Рыгор Гармаш, Святлана Тарасава, Віктар Курловіч, Людміла Шаўчэнка. Пасля творчай сустрэчы ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі. 18 мая 2018 года.





Супрацоўнікі музея з Ганаровым Дыпломам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь




Падчас творчай сустрэчы